# ДЗЕЦІ МАЛЮЮЦЬ ПАМЯЦЬ,



Пячонкіна Яўгенія, 14 гадоў, Гімназія № 58 г. Гомеля.



Каранькова Аляксандра, 12 гадоў,
Уланаўская базавая школа Шклоўскага раёна.

Нядаўна ў Палацы культуры ветэранаў сталіцы падводзілі вынікі рэспубліканскага конкурсу дзіцячага малюнка «Нам мір завешчана берагчы», які сёлета прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Конкурс ужо не першы год праводзіцца Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Беларусбанка. Сёлета ў ім прынялі ўдзел 63 вучня з усіх рэгіёнаў краіны. Узрост удзельнікаў розны — ад 7 да 15 гадоў.

Кампетэнтнае журы на чале з кіраўніком студыі ваенных мастакоў Цэнтральнага дома афіцэраў Мікалаем Апіёкам ацэньвала работы ў трох узроставых катэгорыях. Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў пройдзе ў пачатку мая.

Зрэшты, няважна, хто пераможа. Усе малюнкі шчырыя, прасякнутыя памяццю аб вайне і разуменнем, што падобнае на гэтай зямлі не павінна паўтарыцца. Паглядзіце на некаторыя з іх і пераканайцеся ў гэтым самі.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**



Гіс Ганна, 15 гадоў. Лунненская сярэдняя школа Мастоўскага раёна.



Платаненка Анастасія, 14 гадоў, СШ №12 г. Магілёва.



Шчамялёў Іван, 10 гадоў, Верамейская сярэдняя школа Чэрыкаўскага раёна.